С.А. Ломов // Проблемы управления. – 2008. – № 1 (28). – С. 98 – 101.
6. *Лукашенко, А.Г.* Независимая Беларусь – наш достойный и надежный дом: Послание Президента Респ. Беларусь А.Г. Лукашенко белорусскому народу и Нац. собр. Респ. Беларусь // Советская Белоруссия. – 2007. – 25 апр. – С. 2.
7. *Лукьянович, Н.В.* Прогнозирование геополитических процессов и вероятные сценарии геополитики России: учебник / под общ. ред. В. А. Михайлова; отв. ред. Л.О. Терновая, С.В. Фокин. – М.: Изд-во РАГС, 2007. – С. 348–367.
8. О создании межведомственной комиссии по информатизации в Республике Беларусь: Указ Президента Респ. Беларусь, 7 дек. 1998 г., № 591 // Консультант Плюс: Беларусь. Технология 3000 [Электронный ресурс] / ООО «ЮрСпектр», Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. – Минск, 2010.
9. О создании Совета Безопасности Республики Беларусь: Указ Президента Респ. Беларусь, 5 авг. 1994 г., № 24 // Консультант Плюс: Беларусь. Технология 3000 [Электронный ресурс] / ООО «ЮрСпектр», Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. – Минск, 2010.
10. Панарин, И. Информационная война против Белоруссии / И. Панарин // Правая. Ru [Электронный ресурс]. – 2006. – № 2. – Режим доступа: http://www.pravaya.ru/look/7077. – Дата доступа: 15.05.2010.
11. *Худяков, А.В.* Некоторые аспекты развития аналитические структур на постсоветском пространстве / А.В. Худяков // Труды Ин-та нац. безоп. Респ. Беларусь. – 2002. – № 14. – С. 87–92.
12. *Шейман, В.В.* Наша доктрина – сильная и процветающая Беларусь / В.В. Шейман // Проблемы управления. – 2006. – № 4. – С. 5 – 13.

*SUMMARY*

*The publication reviewed and substantiated the role and place of the analytical work in the mechanism of national security management. We analyzed the organizational and management structure to ensure national security and its analytical component, including an assessment of signs of an emerging institution analysis in modern conditions. The recommendations on the organization of multilevel analysis in the mechanism of national security management. In the publication the basic analytical methods are used as subjects of national security management. The necessity of creating an unified information and analytical space in the system of national security management.*

Паступіў у рэдакцыю 24.05.2010 г.

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

*УДК 325.1(476)*

***С.В. Зенчанка,***
*аспірант кафедры паліталогіі і права БДПУ*

# ТЭАРЭТЫКА-МЕТАДАЛАГІЧНЫЯ АСПЕКТЫ ДАСЛЕДАВАННЯ ДЗЯРЖАЎНАЙ МІГРАЦЫЙНАЙ ПАЛІТЫКІ

Актуальнасць праблемы дзяржаўнай міграцыйнай палітыкі абумоўлена значнасцю дадзенай з'явы для сучаснага свету ва ўмовах глабалізацыі, а таксама і для нашай краіны. Міграцыя ахоплівае ў той ці іншай ступені большасць краін свету і ўплывае на сацыяльна-эканамічныя, прававыя і палітычныя працэсы ў іх. Яна стала адной з важнейшых крыніц фарміравання колькасці насельніцтва асобных краін і кантынентаў, сутнасна ўздзейнічае на прапанову рабочай сілы на рынках працы, што змяняе этнічную і полаўзроставую структуру насельніцтва некаторых дзяржаў, з ёй цесна звязаны перацёк капіталаў прадпрымальнікаў. Амерыканскі грамадскі дзеяч і пісьменнік П.Дж. Бьюкенен лічыць нерэгулюемую міграцыю адной з найбольш значных праблем заходняй цывілізацыі, якая можа прывесці да яе гібелі [1, с. 9]. Сучасная ўніверсалізацыя заходніх палітычных, прававых і эканамічных інстытутаў накладвае свой адбітак на міграцыйныя працэсы. Заходнія дзяржавы, перш за ўсё краіны ЕС, імкнуцца прывесці міграцыйную палітыку да адзінага стандарту. Паколькі на першы план вылучаюцца палітычныя прыярытэты ў трансфармацыі дзяржаў, якія мадэрнізуюцца, то перш за ўсё прадпасылкай вымушанай міграцыі становіцца немагчымасць рэалізацыі інтарэсаў асобы, якая ўзмацняецца канфліктагеннасцю рэгіёна. Сутнасна змяніліся і маштабы міграцый. Так, з 1951 па 1991 г. колькасць мігрантаў у свеце ўзрасла з 1 млн да 21 млн 126 тыс. чалавек [2, с. 3].

Расійскі даследчык У.А. Іонцаў вылучае асноўныя тэндэнцыі, якія характарызуюць сучасную міжнародную міграцыю і носяць па сутнасці заканамерны характар. Ён адзначае глабалізацыю міжнародных патокаў, якасныя ў іх змяненні, што абумоўліваюць развіццё міжнароднай міграцыі рабочай сілы, рост нелегальнай і вымушанай міграцыі, дваісты характар развіцця міжнароднай палітыкі, павелічэнне дэмаграфічнай значнасці міжнароднай міграцыі насельніцтва [3, с. 297]. Гэтыя тэндэнцыі вызначаюць актуальнасць і значнасць дадзенай з'явы для сучаснага становішча свету, які знаходзіцца на ступені глабалізацыі.

Праблема станаўлення і ўдасканалення міграцыйнай палітыкі характэрна і для Рэспублікі Беларусь. Геапалітычнае становішча нашай краіны абумоўлівае праходжанне міграцыйных патокаў, часта нелегальных, па яе тэрыторыі. Для Беларусі больш характэрна транзітная міграцыя. Наша краіна з'яўляецца «перавалачным пунктам» для нелегалаў з краін Азіі ў ЕС. У сувязі з гэтым яна сутыкнулася з тымі праблемамі, што вядзе за сабой нелегальная міграцыя і якія патрабуюць хуткага вырашэння: гандаль

людзьмі, абарот наркотыкаў, пагаршэнне крымінальнага становішча. Такім чынам, перад краінай стаіць задача выпрацоўкі канцэптуальнага падыходу да дзяржаўнай міграцыйнай палітыкі.

Нягледзячы на значнасць дадзенай праблемы, яна не знайшла належнага асвятлення ў манаграфічных і дысертацыйных працах беларускіх навукоўцаў. Таму існуе неабходнасць усебаковай сістэмнай распрацоўкі тэарэтыка-метадалагічных і канцэптуальных асноў дзяржаўнай міграцыйнай палітыкі Рэспублікі Беларусь.

*Мэта артукула* – аналіз тэарэтыка-метадалагічных і канцэптуальных асноў дзяржаўнай міграцыйнай палітыкі. Задачамі з'яўляецца выкладненне катэгарыяльнага апарату, які характарызуе сучасныя міграцыйныя працэсы на асноўных стадыях міграцыі; вызначэнне метадаў даследавання міграцыйных палітыкі дзяржаў; аналіз асноўных тыпаў, фактараў, спецыфікі і тэндэнцый сучасных міграцыйных працэсаў; ацэнка ступені ўплыву міграцый на сацыяльна-эканамічныя і палітычныя працэсы ў розных краінах свету.

Праблемы міграцыі знаходзяцца ў плоскасці вывучэння сацыялогіі, дэмаграфіі, правазнаўства і гісторыі. Гэтыя навукі вывучаюць розныя аспекты міграцыйных працэсаў і таму даюць розныя трактоўкі паняццю «міграцыя». Паліталогія займаецца вывучэннем міграцыйнай палітыкі, якая ажыццяўляецца дзяржавай.

Розныя аспекты тэарэтыка-метадалагічных і канцэптуальных асноў міграцыйнай палітыкі знайшлі пэўнае адлюстраванне ў дысертацыйных, манаграфічных працах і артыкулах заходніх, расійскіх і беларускіх даследчыкаў. Найбольшы ўклад у распрацоўку дадзеных праблем унеслі такія даследчыкі, як П.А. Судаплатаў, У.А. Іонцаў, А.У. Хомра, С.У. Разанцаў, Т. Юдзіна і інш. Асноўную ўвагу навукоўцы звяртаюць на сацыяльна-эканамічныя прычыны і наступствы міграцый, вылучаюць у якасці яе асноўных фактараў нераўнамернасць эканамічнага развіцця развітых і краін са слабай эканомікай, канфліктагеннасць пэўных рэгіёнаў. У сваіх працах яны вывучаюць суадносіны глабальных і рэгіянальных фактараў у фарміраванні структуры, відаў і функцый міграцыі, іх уплыў на міграцыйную палітыку дзяржаў.

У навуковай літаратуры існуе некалькі падыходаў да вызначэння такіх складаных паняццяў, як «міграцыя» і «міграцыйная палітыка». Так, расійскі даследчык Л.Л. Рыбакоўскі прапаноўвае называць міграцыяй любое тэрытарыяльнае перамяшчэнне, якое адбываецца паміж рознымі населенымі пунктамі адной ці некалькіх адміністратыўна-тэрытарыяльных адзінак, незалежна ад працягласці, рэгулярнасці і мэтавай накіраванасці [4, с. 70]. Міжнародная арганізацыя працы пры ААН вызначае тэрмін «працоўны-эмігрант» як «асобы, якая мігрырує з адной краіны ў іншую з мэтай атрымаць працу», і прымае пад увагу любую асобу, якая дапускаецца ў адпаведнасці з законам у якасці працоўнага-мігранта [5, с.11].

Паняцце «міграцыйная палітыка», як ужо адзначалася, не мае ў навуковай літаратуры адназначнага вызначэння. Так, савецкі даследчык А.У. Хомра вызначаў яе як комплекс распрацовак і мерапрыемстваў, якія накіраваны на фарміраванне неабходных патокаў і патрабуемай інтэнсіўнасці міграцыі насельніцтва. Дадзены аўтар называў міграцыйную палітыку практыкай тэорыі міграцыі [6, с. 50].

Прааналізаваўшы ўсе падыходы да вызначэння міграцыйнай палітыкі, можна даць ёй наступную трактоўку. *Міграцыйная палітыка* – гэта комплекс мэтанакіравана распрацаваных дзяржавай заканадаўчых, арганізацыйных і іншых захадаў, накіраваных на рэгуляванне міграцыйных патокаў у нацыянальных інтарэсах. Рэгуляванню могуць падвяргацца ўезд і выезд з краіны, працэдура атрымання грамадзянства і іншых статусаў, працэс выкарыстання рабочай сілы, працэдуры атрымання сацыяльнай абароны мігрантамі, пытанні атрымання права прыстанішча.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Расійскі даследчык П.А. Судаплатаў вылучыў тры складовыя часткі міграцыйнай палітыкі:

- палітыку іміграцыі, якая закранае пытанні права атрымання тым ці іншым асобам пастаяннага ці часовага месца жыхарства, кантролю над міграцыйнымі патокамі, спыненне нелегальнай іміграцыі, візавы рэжым;
- палітыку натуралізацыі, якая звязана з умовамі і працэдурай атрымання грамадзянства легальным імігрантам;
- палітыку сацыякультурнай інтэграцыі, якая рэгулюе праблемы ўключэння імігрантаў (у першую чаргу з іншымі этнічнымі, расавымі, рэлігійным «каранямі») у жыццё краіны свайго прыбывання [7, с.7 – 8].

Пры вывучэнні дадзенай праблемы выкарыстоўваюцца як агульнавуковыя, так і спецыяльныя метады.

Да найбольш важных агульнавуковых метадаў даследавання міграцыйнай палітыкі можна аднесці гісторыка-параўнальны, ці кампаратыўны, сістэмны, дыялектычны і кольксаны. Гісторыка-параўнальны метад дазваляе вылучыць найбольш сутнасныя адрозненні ў міграцыйнай палітыцы Рэспублікі Беларусь і іншых дзяржаў на розных этапах яе правядзення. Сістэмны – дае магчымасць вывучыць дадзеную з'яву ва ўсёй шматвобразнасці яе праяў і пры ўліку ўсіх фактараў. З дапамогай дыялектычнага метаду можна прасачыць станаўленне і развіццё дзяржаўнай міграцыйнай палітыкі. Колькасны – даз-

валяе ацаніць маштабы міграцыйных працэсаў у той ці іншай дзяржаве. Пры вывучэнні міграцыйнай палітыкі неабходна выкарыстоўваць таксама метады палітыка-прававога аналізу (метад экспертных ацэнак, параўнання, аналогіі, абагульнення).

Пры аналізе кіравання міграцыйнымі працэсамі існуе неабходнасць выкарыстання спецыяльных метадаў даследавання. Да найбольш агульных метадаў даследавання дадзенай з'явы адносяцца сітуатыўны аналіз і ацэнка тэндэнцый магчымага развіцця тых ці іншых працэсаў як пры адсутнасці мэтанакіраванага грамадскага ўздзеяння на іх, так і пры аказанні якога-небудзь уздзеяння ва ўмовах ужо існуючага, але перастаўшага даваць эфект. Яшчэ адным неабходным метадам з'яўляецца прагназіраванне (у шэрагу выпадкаў планаванне) неабходных параметраў развіцця гэтага працэсу. Найбольш значнымі элементамі кіравання з'яўляецца распрацоўка і правядзенне палітыкі, якая адпавядае пастаўленым мэтам, абгрунтаванне і выкарыстанне неабходных рычагоў уздзеяння на аб'ект кіравання [4, с. 70].

Пры сітуатыўным аналізе міграцыі неабходна інфармацыйнае забеспячэнне, гэта значыць атрыманне дастаткова поўных і дакладных звестак аб розных баках міграцыйных працэсаў і магчымых іх наступствах. Па-другое, важна мець абгрунтаваную сістэму паказчыкаў міграцыі, каб можна было вылучыць з яе тыя, што найбольш адэкватна раскрываюць праявы той ці іншай стадыі міграцыйнага працэсу. Па-трэцяе, неабходна распрацоўка канцэптуальнага падыходу, які дазваляе з дапамогай тыпалагізацыі выявіць дамінуючую міграцыйную праблему. Крыніцамі звестак аб міграцыі выступаюць бягучы ўлік, перапісы насельніцтва і спецыяльныя абследаванні насельніцтва.

Найбольш важным метадалагічным прынцыпам сітуатыўнага аналізу міграцыі насельніцтва з'яўляецца канцэптуальны падыход. Сутнасць яго ў вылучэнні міграцыйных праблем, а затым класіфікацыі ўсіх тэрытарыяльных падраздзяленняў па аднародных міграцыйных праблемах. Для стварэння класіфікацыі неабходна вырашыць некалькі задач. Першая з іх – выяўленне, апісанне і ранжыроўка міграцыйных праблем па іх важнасці і актуальнасці з пункта гледжання перспектыў сацыяльна-эканамічнага і дэмаграфічнага развіцця краін.

Вызначальнае месца ў здзяйсненні рэгулявання міграцыйнымі працэсамі мае выбар тэхналогій кіравання, канкрэтных механізмаў фарміравання дзяржаўнай палітыкі, якая на справе суадносіць эканамічныя і палітычныя прыярытэты з рэальнай практыкай. Пераўтварэнне палітычных задум ў канкрэтныя мэты дзяржаўнага кіравання – складаны і супярэчлівы працэс. Фарміраванне палітыка-прававых механізмаў рэгулявання таго ці іншага працэсу ўяўляе сабой асаблівую сферу прадстаўніцтва сацыяльных інтарэсаў з уласцівай ім нацыянальнай спецыфікай.

Эфектыўнае кіраванне заснавана, перш за ўсё, на веданні ўнутраных заканамернасцей, якія вызначаюць генезіс, станаўленне і дынаміку міграцыйных працэсаў. Гэта значыць, кіраванне міграцыйнымі працэсамі патрабуе вывучэння эвалюцыйных, заканамерных і лакальна-спецыфічных характарыстык сучасных міграцый. Пры гэтым асаблівасці міграцыйных працэсаў залежаць ад этнасацыяльнага і этнакультурнага аблічча кожнай самастойнай краіны. Акрамя таго, іх спецыфіка абумоўлена тым, што асноўным першасным элементам міграцыі з'яўляецца чалавек, які валодае ўстойлівымі ўнутранымі і знешнімі сацыяльнымі, этнакультурнымі сувязямі. Міграцыя часта з'уляецца адлюстраваннем палітычных і сацыяльных перамен [8, с.13 – 15].

Важнай задачай пры даследаванні дзяржаўнай міграцыйнай палітыкі з'яўляецца тыпалагізацыя міграцыйнага працэсу. У навуцы існуюць розныя тыпалогіі міграцыйнага руху, якія значна адрозніваюцца па форме і складзе.

Расійскі навуковец С.У. Разанцаў распрацаваў тыпалогію міграцый. На аснове геаграфічнай прыкметы ён вылучыў два асноўныя тыпы міграцыі: знешняя (міжнародная) і ўнутраная (унутрыдзяржаўная). Знешняя міграцыя падраздзяляецца на два асноўныя класы – міжкантынентальная і ўнутрыкантынентальная. Сярод знешніх унутрыкантынентальных міграцый можна вылучыць міграцыі двух парадкаў – міграцыю паміж дзяржавамі і міграцыю паміж буйнымі рэгіёнамі. Адносна знешняй міграцыі можна меркаваць аб існаванні двух асноўных відаў – іміграцыю і эміграцыю.

Па структурных прыкметах міграцыя падраздзяляецца на тыпы: узростава-палавы, этнічны, сямейны, адукацыйны. У якасці элементарнай адзінкі (віду) можна лічыць міграцыйныя патокі, якія аб'яднаны якой-небудзь прыкметай (узрост, пол, нацыянальнасць, спецыяльнасць). Пры гэтым дапускаюцца тэрміны «сямейная міграцыя», «міграцыя насельніцтва працоўнага ўзросту», «міграцыя высокакваліфікаваных спецыялістаў», «жаночая міграцыя», «этнічная міграцыя».

Па часе прыбыцця мігранта на новае месца жыхарства ці прыкладанні працы магчыма вылучэнне двух асноўных тыпаў міграцыі – пастаянны і часовы. Пастаяннымі міграцыямі можна лічыць перамяшчэнні, якія звязаны са змяненнем месца жыхарства на тэрмін больш года.

Часовы тып міграцыі можна падраздзяліць на два асноўныя класы – кароткатэрміновую

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

да 1 года) і доўгатэрміновую. Кароткатэрміновую міграцыю можна раздзяліць на міграцыю двух парадкаў – рэгулярную і нерэгулярную. Да апошняга тыпу міграцыі можна аднесці такія яе віды, як штодзённыя маятнікавыя (у тым ліку прыгранічныя), сезонныя, вахтавыя міграцыі.

Па мэтах міграцыя падраздзяляецца на некалькі асноўных тыпаў. Сярод іх: працоўная, камерцыйная, навучальная міграцыя, міграцыя з мэтай уз'яднання і стварэння сям'і, міграцыя ў сувязі з адпачынкам і турызму, паломніцтва.

Па прычынах міграцыя падраздзяляецца на тры асноўныя тыпы – добраахвотная, вымушаная і прымусовая (дэпартацыя) [9, с. 14 – 15].

На фарміраванне міграцыйных паводзін людзей і сацыяльных груп уплывае кангламерат фактараў – сацыяльна-эканамічныя, палітычныя, этнічныя, рэлігійныя, дэмаграфічныя, экалагічныя і інш.

Асноўнымі фактарамі, якія вызначаюць міграцыю ў свеце, у тым ліку і ў Беларусі, з'яўляюцца перамены ў былых сацыялістычных краінах: распад СССР, адкрыццё знешніх межаў у гэтых краінах; сутнасная розніца ва ўзроўні жыцця насельніцтва паміж краінамі Усходняй і Заходняй Еўропы, а таксама паміж дзяржавамі Захаду і краінамі Азіі, Лацінскай Амерыкі і Афрыкі, што развіваюцца. Яна праяўляецца ў сутнаснай дыферэнцыяцыі ўзроўняў заработнай платы. З аднаго боку, узніклі і працягваюць існаваць маштабныя міграцыйныя патокі ў эканамічна развітыя краіны Еўрапейскага саюза з менш развітых краін СНГ (у тым ліку і з Беларусі). З другога боку, больш нізкі ўзровень жыцця і прыбыткаў .у краінах Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі, што развіваюцца, у параўнанні з дзяржавамі Усходняй Еўропы, стаў прычынай узнікнення ўстойлівых сувязей паміж імі.

На сучасным этапе ўсё больш важную ролю займае працоўная міграцыя. Міграцыя, па меркаванні большасці даследчыкаў, з'ява перш за ўсё эканамічная [5, с.12].

Сучасны міграцыйны працэс мае ўніверсальны характар, які абумоўлены мадэрнізацыйнымі, глабалізацыйнымі тэндэнцыямі, рэгіянальнымі сацыякультурнымі і эканамічнымі фактарамі, палітычнай і прававой інстытуцыялізацыяй правоў і свабод мігрантаў у міжнародным заканадаўстве. Глабальны характар сучаснай міграцыі вызначаецца сістэмай палітычных, прававых і культурных дэтэрмінант з улікам іх рэгіянальнай спецыфікі. Да палітычных фактараў адносяцца ўмовы і магчымасці рэалізацыі правоў і свабод чалавека, якія адпавядаюць палітычным рэжымам. Да прававых – інстытуцыялізацыя правоў мігрантаў, якія рэгламентаваны міжнароднымі нарматыўна-прававымі дакументамі ў нацыянальных заканадаўствах краін, што прымаюць мігрантаў. Да эканамічных – стан эканомікі рэгіёнаў эміграцыі і іміграцыі. Да культурных – умовы і магчымасці рэалізацыі этнічнай і культурнай ідэнтычнасці мігрантаў.

Такім чынам, міграцыя насельніцтва ўяўляе сабой складаную і шматгранную з'яву. У сучасным свеце міграцыйныя працэсы атрымалі глабальны, шырокамаштабны характар, што выклікана сацыяльна-эканамічнымі, палітычнымі і іншымі фактарамі. Гэтыя працэсы значна ўплываюць на развіццё многіх дзяржаў, у тым ліку і Рэспубліцы Беларусь. У сувязі з гэтым узнікае неабходнасць у распрацоўцы тэарэтыка-метадалагічных і канцэптуальных асноў фарміравання і правядзення эфектыўнай дзяржаўнай міграцыйнай палітыкі з улікам канкрэтнай спецыфікі.

ЛІТАРАТУРА

1. *Бьюкенен, П. Дж.* На краю гибели / Патрик Дж. Бьюкенен; пер. с англ. М. Башкатова. – М.: АСТ:АСТ МОСКВА, 2008. – 349 с.
2. *Мишуров, В.М.* Миграционные процессы в современной России: институционально-правовой анализ: автореф. дис … канд. юрид. наук: 23.00.02 / В.М. Мишуров; Ростовск. юрид. ин-т МВД России. – Ростов н/Д., 2004. – 23 с.
3. Эмиграция и репатриация в России / В.А. Ионцев [и др.] М.: Попечительство о нуждах российских репатриантов, 2001. – 490 с.
4. *Рыбаковский, Л.Л.* Миграция населения: прогнозы, факторы, политика / Л.Л. Рыбаковский; АН СССР. Ин-т социол. исслед.; отв. ред. акад. АН СССР Т.И. Заславская – Москва: Наука, 1987. – 199 с.
5. Новейшие изменения во внутренней и внешней миграции населения в России и их экономическое значение / под ред. проф. Б.С. Хорева [и др.]; МГУ им. М.В. Ломоносова. – М.: Ассоциация «Гуманитарное знание», 1994. – 90 с.
6. *Хомра, А.У.* Миграция населения: вопросы теории, методики изучения / А.У. Хомра; АН УССР Институт экономики. – Киев: Наукова думка, 1979. – 147 с.
7. *Судоплатов, П.А.* Миграционные процессы и миграционная политика в странах Европейского Союза: автореф. дис. … канд. экон. наук.: 08.00.05 / П.А. Судоплатов; Ин-т соц.-полит. исслед. Российской акад. наук. – М., 2006. – 28 с.
8. *Ежова, М.Ю.* Управление миграционными процессами в Российской Федерации в условиях постсоветских трансформаций: этнополитический аспект: автореф. дис. … канд. полит. наук: 23.00.02 / М.Ю. Ежова; Российская академия государственной службы при Президенте Российской Федерации – М., 2004. – 25 с.
9. *Рязанцев, С.В.* Миграционные процессы в Европе и их социально-экономические последствия (вопросы теории и методики исследования): автореф. дис. … д-ра экон. наук 08.00.05 / С.В. Рязанцев; Рос. акад. наук. Институт социально-политических исследований. – М., 2002. – 46 с.

SUMMARY

*The essence of the role and place of state migration policy in the context of globalization and various approaches to its definition are analyzed. General scientific and special methods of analysis of migration processes and state migration policy are characterized. Factors that promote migration processes in the modern world, their development trends, the impact on the socio-economic and political status of countries are identified. The structure and directions of state migration policy are analyzed.*

Паступіў у рэдакцыю 02.03.2010 г.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ